
3-94
Пралеска
3-94
Індэкс 74983
ДАШКОЛЬНАЕ ВЫХАВАННЕ
Слова аб КАХАННІ
МАСТАЦКА-МАЎЛЕНЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ДАШКОЛЬНІКАЎ (метадычныя рэкамендацыі)
ЯК ПАСЯБРАВАЛІ ДАРОСЛЫЯ І ДЗЕЦІ
Сакавік — Свята жанчын

# Пралеска

ДАШКОЛЬНАЕ ВЫХАВАННЕ
N 3 (32), сакавік, 1994
Штомесячны навукова-метадычны ілюстраваны часопіс
Выходзіць са жніўня 1991 года
Заснавальнік:
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

1 Алесь Сачанка. "Кактусы"
Ганна Давыдава. Женщина-воспитатель

**НА ШЛЯХУ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ**

3 Людміла Забалоцкая. Праблемы жанчын разумее толькі жанчына
5 Любоў Раманоўская. З верай у дзень заўтрашні
7 Алена Блажыеўская. Мове роднай пакланіцца
Свята матулінай мовы
10 Уладзіслаў Басько. Фізкультуры — фізкульт-ура!

**У КАНСПЕКТ ПРАКТЫКУ**

12 Зося Кустава. Азбукоўнік і лічылка
15 Алена Варанкова. Свята прылёту бусла
16 Валянціна Кукса. Вязе вясна ясныя дзянёчкі
18 Алесь Марціновіч. Мнагафарбны свет
35 Марыя Касабуцкая, Аляксандр Касабуцкі. Гаворым па-англійску
39 Зоя Лысенка. Сола на два галасы

**АФІЦЫЙНЫ РАЗДЗЕЛ**

11 Хроніка
19 Праграма сямейнага дзіцячага сада
29 Арганізацыя работы гуртка па мастацка-маўленчай дзейнасці

**"БУСЛЯНКА" — СЯМЕЙНЫ КЛУБ**

43 *Юрыдычны клуб*
44 Галіна Ступчык. Неразлучныя сябры — дарослыя і дзеці
47 *Псіхалагічны практыкум*
Якаў Каламінскі. Развіццё псіхікі дзіцяці
50 З куфэрка Тацццяны
Этыка , этыкет

**ВОЛЬНАЯ СТАРОНКА**

48 Аляксандр Асаў. Слова аб каханні

**ВЯСЁЛЫ ВУЛЕЙ**

50 Ніна Галіноўская. Яблыкі
*З народнага гумару*
51 Пятро Сушко. Дудка-самагудка
Жанчыны вачамі мужчын

25 *Чароўны музей.* Такая загадкавая расліна
27 Домікі для птушак
28 А. Жураўскі. *Нотны аркуш.* 8 Сакавіка
42 Сустрэліся два пісьмы
43 Імя тваё і мае
Фонд Сораса — Беларусь
52 Творчасць нашых чытачоў
53 Календары

**Галоўны рэдактар**
А. І. САЧАНКА

**Рэдакцыйная калегія:**
Г. А. БУТРЫМ, П. Ф. ВАСЮЧЭНКА, Л. В. ЗАБАЛОЦКАЯ, В. К. ЗУБОВІЧ, Т. М. КАРАСЦЯЛЁВА, Я. Л. КАЛАМІНСКІ, А. І. КАРПОВІЧ, Г. І. КАШЭЎНІКАВА, Л. І. ЯКУБОЎСКАЯ

А. П. Васючэнка (тэхнічны рэдактар)
Л. П. Жыткавец (карэктар)
М. М. Будчанін (фотакарэспандэнт)

Адрас рэдакцыі :
220104, Мінск,
вул. Матусевіча, 36, к. 2,
тэлефон 55-28-94

Выдавецтва "ПОЛЫМЯ"

© "Пралеска", 1994

Пераносы некаторых слоў зроблены не па правілах граматыкі, а паводле магчымасцей камп'ютэра.

Падп. да друку з арыгінал-макета 15.03. 94. Фармат 60x84 1/8. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 6,5. Ум. фарб.-адбіт. 11. Ул.-выд. арк. 9,3. Наклад 23574 паасобнікаў. Зак. 162. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". 220013, Мінск, праспект Францыска Скарыны, 79.

Пробныя адбіткі з фотаформ, вырабленых Беларускім Домам друку, атрыманы рэдакцыяй . 02. 94.

ДА ВЕДАМА АЎТАРАЎ!
За дакладнасць прыведзеных у публікацыях фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары.
Рэдакцыя можа друкаваць пэўныя матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара .
Просім у сваіх допісах паведамляць свой дакладны адрас, тэлефон, прозвішча, імя і імя па бацьку. Рэдакцыя прымае для разгляду рукапісы абёмам не больш як 10 старонак, надрукаваныя праз два інтэрвалы на машынцы ў двух экземплярах, не ўступаючы ў перапіску з аўтарамі.

***Задача N 2***

Аднойчы сын спытау бацьку: "Тата, навошта ты курыш? Курыць жа шкодна!" Бацька паабяцау кінуць, але не стрымау слова. Малы, убачыўшы бацьку з цыгарэтай, спытау: "Тата, ты ж абяцаў кінуць курыць?"

Як бацьку выйсці са складанага становішча, у якім ён аказаўся?

***Задача N 3***

Пяцігадовы Саша гуляе са старой машынай, рамантуе яе, стукае. Тата звярнуў увагу на занятак сына, прынёс цвікі, малаточак, нейкія планкі. Хлопчык з задавальненнем прыняу дапамогу таты. Падышла маці, спытала, чым яны займаюцца. Саша стау ажыўлена тлумачыць. "Драбязой вы займаецеся, машына старая, паламаная, яе дауно трэба было выкінуць, насмецілі толькі. Лепш бы новую купіць, дзіцяці было б прыемней", — адказала маці і пайшла на кухню.

Хто правы? Ці варта падахвочваць імкненне хлопчыка да рамонту старых цацак? Ці не лепш сапрауды, з пункту гледжання эстэтычнага выхавання, купіць хлопчыку новую машыну?







*Якаў КАЛАМІНСКІ*

# РАЗВІЦЦЁ ПСІХІКІ ДЗІЦЯЦІ

*(Працяг. Пачатак у № 1)*

## ГІСТАРЫЧНЫ ХАРАКТАР УЗРОСТАВАЙ ПЕРЫЯДЫЗАЦЫІ

Сучаснае дзяленне чалавечага жыцця на эпохі і перыяды здаецца настолькі натуральным і адвечным, што цяжка сабе уявіць нейкі іншы варыянт. Звычайнае трыо: дзяцінства, малалецтва, юнацтва — быццам такое ж непарушнае, як вясна, лета, восень, зіма... А на самай справе усё тут не так проста.

Зададзім сабе пытанне, якое толькі на першы погляд можа здацца марным: навошта патрэбна дзяцінства? Ці дапушчальна ў наш імклівы век, калі хранічна не хапае часу на засваенне лавінападобнага патоку інфармацыі, а тым больш на яе памнажэнне і практычнае выкарыстанне, ці дапушчальна (і ці не лепш?) расходаваць першы дзесятак гадоу на гульні, на доктара Айбаліта, на палачкі-лічылачкі? Можа, безнадзейна састарэу паэтычны лозунг: "Весяліцеся, дзеці, гуляйце на волі, на тое й дзяцінства шчаслівае ў вас"?

Спецыяльныя даследаванні і супастаўленні паказалі, што дзяцінства як асобы, якасна своеасаблівы перыяд існавання жывых істот — гэта прадукт эвалюцыі, а чалавечае дзяцінства — яшчэ і вынік гістарычнага развіцця грамадства. Аказваецца, чым вышэй знаходзіцца від на эвалюцыйнай лесвіцы, тым даужэйшы перыяд дзяцінства. У ніжэйшых жывёл практычна наогул няма дзяцінства — тое прымітыунае існаванне, якое ім належыць весці, не патрабуе спецыяльнай эпохі прыжыццёвай падрыхтоукі ад кожнай істоты. Хапае фонду спадчынных прыстасавальніцкіх рэакцый (інстынктаў).

Чалавечае дзіця таму і з'яўляецца на свет самым бездапаможным у параўнанні з усімі астатнімі дзіцянятамі, што яму належыць асвоіць, прысвоіць вялізнае багацце культуры, якое да яго нараджэння назапасілі мінулыя пакаленні. Чалавек свабодны ад закасцянелых інстынктыўных праграм паводзін. Кожнае пакаленне гатова засвоіць любую новую праграму і унесці ў яе свой уклад. Беднасць чалавечага дзіцяці на першых этапах дзяцінства — гэта ўмова яго будучага багацця, гэта магчымасці, якія будуць рэалізаваны ў далейшым.

Чалавечае дзяцінства — не толькі прадукт эвалюцыі, але і вынік гістарычнага развіцця. Д. Б. Эльконін паказау, што дзяцінства і яго нязменны спадарожнік — ролевая гульня — звязаны з узроўнем развіцця прадукцыйных сіл грамадства. Дзяцінства самога чалавецтва амаль не пакідала месца для, напрыклад, індывідуальнага дзяцінства кожнага члена першабытнага згуртавання. У тую далёкую гістарычную эпоху дзеці яшчэ не складалі спецыяльнай, адносна ізаляванай групы, жыццё якой ідзе па сваіх законах, як да гэтага прывыклі ў нашы дні. Прастата грамадскай вытворчасці дазваляла дзецям прама уключацца ў яго працэс у якасці паўнапраўных удзельнікаў. У грамадствах, якія стаяць на нізкіх этапах развіцця, дзеці хутка становяцца самастойнымі. Напрыклад, даследчык каракаў С. М. Сцябніцкі на аснове назіранняў, праведзеных у 20-я гады нашага стагоддзя, адзначау, што рэзкага дзялення на дзяцей і дарослых у іх няма. Дзеці — раўнапраўныя і роўнапаважаныя члены грамадства. За агульнай размовай іх словы выслухоўваюцца таксама ўважліва, як і гаворка дарослага. Дарэчы, ці памятаеце вы някрасаўскага мужычка-з-пазногцік: "А які табе годзік? — Шосты мінуў..." Дарэчы сказаць, наўрад ці цяперашні яго равеснік з пачуццём уласнай годнасці горда заявіць: "Сям'я вялікая, ды два чалавекі ўсяго мужыкоў у ёй — мой бацька ды я..." Гэты "дарослы" узровень самасвядомасці ў вясковых дзяцей параўнальна недалёкага мінулага звязаны з тым, што ў іх, гаворачы словамі А. П. Чэхава, у дзяцінстве не было дзяцінства: яны надта рана ўваходзілі ў перыяд дарослаці, дзе асноўная дзейнасць — ужо не гульня, а праца.

Іменна *вядучая дзейнасць чалавека* вызначае стадыю яго асабістай гісторыі. Тут аднолькава шкодныя і пераскок праз перыяд, і штучная затрымка.

*(Працяг будзе)*